# ПРАМОВА ДЭПУТАТА ПАНАМАРЭНКА П. К.

(Беларуская ССР)

Таварышы дэпутаты!

Унесены Саюзным Урадам на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР Дагавор паміж Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Злучаным Каралеўствам у Вялікабрытаніі, а таксама прынятае Пагадненне паміж Урадам Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Злучанымі Штатамі Амерыкі маюць буйнейшае міжнароднае і гістарычнае значэнне для ўсіх свабодалюбівых народаў, якія ўдзельнічаюць у барацьбе супроць гітлераўскай Германіі.

Тры вялікія дэмакратычныя дзяржавы — Совецкі Саюз, Вялікабрытанія і Злучаныя Штаты Амерыкі аб'ядналі свае намаганні ў мэтах поўнага разгрома гітлераўскай Германіі і справядлівага пасляваеннага наладжання міру.

Дагавор і Пагадненне ўзмацняюць баявое садружаства свабодалюбівых народаў у вайне супроць гітлераўскай Германіі, якая прадстаўляе велізарную пагрозу народам усяго свету.

Дагавор і Пагадненне сустрэлі ўсеагульнае адабрэнне нашага народа, а таксама адабрэнне грамадскай думкі ўсіх свабодалюбівых краін. Гэтыя акты справядліва ацэньваюцца, як важнейшая падзея ў жыцці Еўропы з пачатку вайны. Яны азначаюць паўнейшы правал гітлераўскіх планаў раз'еднання сіл дэмакратычных дзяржаў.

Велізарныя ваенна-стратэгічныя рэсурсы ўсіх дэмакратычных краін зараз з усёй сілай павінны абрушыцца супроць гітлераўскай Германіі ў імя высокай, благароднай мэты вызвалення ўсіх народаў, стогнучых пад тыраніяй нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Гітлераўскія разбойнікі паднялі акрываўлены нож над усім чалавецтвам, над вялікімі дэмакратыямі свету, над сучаснай культурай і цывілізацыяй. Вар'яты, растліўшыя цэлае пакаленне германскага народа, спадзяваліся растліць усё чалавецтва, ператварыць увесь свет у папялішчы, каб на гэтых руінах узняць свой пракляты сцяг цемрашальства, чалавеканенавісніцтва, рабства, амярцвення ўсяго квітнеючага і жывога на зямлі. Ахмялеўшыя ад лёгкай перамогі ў Еўропе, яны думалі заваяваць увесь свет, спадзяваючыся ўнесці раскол у адзінства свабодалюбівых народаў.

Нямецка-фашысцкая армія, абрушыўшая на Беларускую Совецкую Рэспубліку ўсю сілу першага ўдара вайны, зграяй шалёных сабак уварвалася на прасторы нашай квітнеючай радзімы, заліваючы крывёю сыноў і дачок беларускага народа нашу зямлю, у попел і прах ператвараючы ўсё, што створана творчай і ўпартай працай беларускага народа за цэлыя дзесяцігоддзі.

Суровыя і цяжкія дні перажывае беларускі народ. Стогны людзей, якіх закатавалі ў Мінску, Магілеве, Полацку, Бабруйску, Шклове і другіх гарадах і сёлах Беларусі, абляцелі ўвесь свет.

Ніколі за ўсю сваю нацыянальную гісторыю беларускі народ не падвяргаўся такой небяспецы. Гутарка ішла і ідзе аб жыцці, або смерці цэлага народа. Жорсткім тэрорам, бясcэнсными забойствамі гітлераўцы разлічвалі запалохаць беларускі народ, зламаць яго волю да супраціўлення, ператварыць у бяссловных рабоў нямецкіх захопнікаў.

Але гітлераўцам не ўдалося і не ўдасца ніколі зламаць волю беларускага народа. Мужны беларускі народ падняўся на вялікую вызваленчую барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, за сваю векавую культуру, за сваю родную зямлю, за сваю нацыянальную чэсць і незалежнасць.

Многа сотняў тысяч беларусаў самаадданна змагаюцца ў радах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, плячом да пляча з усімі народамі Совецкага Саюза супроць агульнага смяртэльнага ворага — гітлераўскіх захопнікаў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі